УДК 811.161.3'373

# КАНТАМІНАЦЫЯ ЯК СПОСАБ СЛОВАЎТВАРЭННЯ АКАЗІЯНАЛІЗМАЎ У ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАХ А. РАЗАНАВА

***М.А. Самсонава*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***В.М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Да аказіяналізмаў, створаных па непрадуктыўных у сучаснай мове словаўтваральных мадэлях, перш за ўсе аднасяцца аказіяналізмы, створаныя спосабам кантамінацыі (міжслоўнас накладанне (тэрмін Н. А. Янка-Трыніцкай), міжслоўнае сумяшчэнне (тэрмін І. С. Улуханава), імпазіцыя (тэрмін А. В. Солахава) і інш.), г. зн. аб'яднаннем «двух слоў у адно, у якім поўнасцю захоўваюцца абодва злучаныя словы, але пэўны фанемны адрэзак новага слова належыць адначасова абедзвюм матывавальным часткам» [2, с. 52]. Адметнай асаблівасцю кантамінацыі як спецыфічнага спосабу словаўтварэння з'яўляецца аб'яднанне дзвюх утваральных асноў у межах адной вытворнай адзінкі. Семантыка новага слова складаецца са значэнняў матывавальных адзінак і, як правіла, ускладняецца канатацыяй ацэнкі, экспрэсіі, моўнай гульні. Абодва матывавальныя словы, не будучы цалкам экспліцытна прадстаўленымі ў вытворным слове, выразна ўспрымаюцца чытачом паэтычнага тэксту.

Звернемся да некаторых аказіяналізмаў А. Разанава, створаных спосабам кантамінацыі, словаўтварэнне якіх суправаджаецца накладаннем марфемных частак дзвюх асноў, пры гэтым фанемы або ўсечаныя часткі марфемы часцей за ўсё супадаюць, напрыклад, аб'яднанне асновы назоўніка *кій* з асновай другога назоўніка *якасць* утварае аказіяналізм *кіякасць* (*кі<u>й</u>* + *<u>я</u>касць*) пры дапамозе фанемы (спецыфічнага інтэрфікса) *j*: *<u>Кій</u> – кіраўнік, і які б ен ні быў па сваёй* ***«кіякасці»*** *– цяжкі ці лёгкі, стрункі ці камлюкаваты, ён ідзе наперадзе і паказвае вандроўніку кірунак* [1, с. 421]; *звяздар* (*звяз<u>да</u>* + *<u>дар</u>* – аплікацыя): *Раскайвайся, паўстанец,* ***звяздар*** *і багаслоў* [1, с. 30] і інш.

Пры такім аб'яднанні адбываецца збліжэнне рэалій, якія ляжаць у аснове семантыкі аб'яднаных слоў. Значэнне такога кантамінаванага слова ўяўляе сабой складанае семантычнае спалучэнне некалькіх слоў.

**Літаратура**

1. **Разанаў, А.** Танец з вужакамі: Выбранае / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. – 462 с.

2. **Улуханов, И. С.** Единицы словообразовательной системы русского языка и их лексическая реализация / И. С. Улуханов ; Российская академия наук, Институт русского языка им. В. В. Виноградова. – М. : Б. и., 1996. – 221 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова